Ба 29591

ТАВАРЫСТВА ПА РАСПАЎСЮДЖВАННЮ
ПАЛІТЫЧНЫХ І НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ БССР

М. Г. ЛАРЧАНКА,
праваДзейны член Таварыства,
кандыдат філалагічных навук

# ТВОРЧАСЦЬ
# МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Стэнаграма
публічнай лекцыі,
прачытанай
у г. Мінску

Б 29591

ВЫДАВЕЦТВА АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
МІНСК 1949

Ба 29591

ТАВАРЫСТВА ПА РАСПАЎСЮДЖВАННЮ ПАЛІТЫЧНЫХ
І НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

М. Г. ЛАРЧАНКА,
правадзейны член Таварыства,
кандыдат філалагічных навук

# ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Стэнаграма публічнай лекцыі,
прачытанай у г. Мінску.

Б 29591

1968 г.

ВЫДАВЕЦТВА АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР

МІНСК 1949

Рэдактар
кандыдат філалагічных навук
**В. Барысенка**

25. 04. 2009

## I

Максім Багдановіч з'яўляецца таленавітым паэтам, класікам беларускай літаратуры. Ён уступіў на літаратурную арэну ў пару рэакцыі, якая пачалася пасля часовага паражэння рэвалюцыі 1905 года, калі, як сказана ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)», узніклі «распад і разлажэнне ў асяроддзі спадарожнікаў рэвалюцыі» і асабліва «ў асяроддзі інтэлігенцыі», калі «наступленне контррэвалюцыі ішло і на ідэалагічным фронце», калі «паявілася арава модных пісьменнікаў», якія «крытыкавалі» і «разносілі» марксізм, аплёўвалі рэвалюцыю, здзекваліся з яе, выслаўлялі здрадніцтва, выслаўлялі палавую распусту пад выглядам «культу асобы»[1]).

Гэтая арава модных пісьменнікаў, у якую ўваходзілі сімвалісты, акмеісты і інш., услаўляла рэакцыйную тэорыю «мастацтва для мастацтва», апарочвала слаўныя рэвалюцыйна-дэмакратычныя традыцыі класічнай рускай літаратуры, адкрыта і нахабна выступала супраць рэвалюцыйнага мастацтва, якое ўзначальвалася большэвіцкай партыяй, вялікім пралетарскім пісьменнікам Алексеем Максімавічам Горкім. Беларускія пісьменнікі Янка Купала і Якуб Колас, вялі барацьбу з прадстаўнікамі рэакцыйнага, буржуазна-нацыяналістычнага напрамку, ішлі за вялікім Горкім па шляху рэвалюцыйнага мастацтва, развіваючы ў новых умовах эстэтычныя прынцыпы Чэрнышэўскага, Дабралюбава, Некрасава, Шэўчэнкі.

Максім Багдановіч прышоў у літаратуру не непасрэдна ад жыцця, як, скажам, Янка Купала і Якуб Колас, а ад кнігі, ад захаплення этнаграфіяй і фальклорам. Не будучы рэвалюцыянерам па свайму светапогляду, але выхаваны на традыцыях рускай класічнай літаратуры, ён прымыкае да купалаўска-коласаўскага напрамку як прадстаўнік дэмакратычнай інтэлігенцыі, дэмакратычнай літаратуры. Яго эстэтычныя погляды, як і сама высокамастацкая творчасць, супярэчлівы. Гэтая супярэчлівасць праяўляецца ў тым, што Максім Багдановіч, не разумеючы гістарычных законаў

---

[1]) Гісторыя ВКП(б). Кароткі курс, ДВБ, Мінск, 1938 г., стар. 95.

развіцця грамадства, не бачачы ясна ў грамадскім развіцці той сілы, якая толькі і здольна здзейсніць мары прыгнечаных аб свабодзе і шчаслівым жыцці, не разабраўшыся ў ідэйна-класавай сутнасці тагочасных модных літаратурных напрамкаў, аддае пэўную даніну сімвалізму. З другога-ж боку, шчыра сімпатызуючы вялікім рэвалюцыйна-дэмакратычным традыцыям рэалізма і народнасці класічнай рускай літаратуры, кіруючыся пачуццём жыццёвай праўды, будучы высока адукаваным і перадавым інтэлігентам, пераадольвае варожыя ўплывы дэкадэнцтвуючых эстэтаў-сімвалістаў і цвёрда стаіць на пазіцыях дэмакратычнага мастацтва, рэалістычнай літаратуры, уступаючы нават у барацьбу з дэкадэнтамі-мадэрністамі, буржуазнымі прапаведнікамі рэакцыйнай тэорыі «мастацтва для мастацтва».

Максім Багдановіч — паэт вялікай культуры, вялікага арыгінальнага таленту. Яго лепшыя дэмакратычныя творы — узор сапраўднага мастацтва, узор класічнай беларускай паэзіі.

## II

Нарадзіўся Максім Адамавіч Багдановіч 27 лістапада (ст. ст.) 1891 г. у Мінску, у сям'і настаўніка-этнографа Адама Юр'евіча Багдановіча. Бацька паэта паходзіў з сялян Бабруйскага павету. Маці Максіма Адамавіча, Марыля Апанасаўна, была дачкою дробнага чыноўніка, які служыў наглядальнікам Ігуменскай павятовай больніцы; скончыла ў Пецербургу жаночую настаўніцкую школу.

Асяроддзе, у якім рос і выхоўваўся М. Багдановіч, спрыяла яго культурнаму развіццю. Бацька пісьменніка меў сваю ўласную бібліятэку, якая складалася пераважна з твораў класічнай літаратуры і фальклору. Максім Адамавіч яшчэ ў маленстве захапляўся народнымі беларускімі песнямі і казкамі, якія чытаў і расказваў яму яго бацька. Будучы вучнем гімназіі, М. Багдановіч чытаў і перачытваў этнаграфічныя зборнікі па беларускаму фальклору, якія старанна захоўваліся ў бібліятэцы бацькі пісьменніка. Усё гэта не прайшло бясследна для паэта; ён палюбіў вусную народную творчасць і пасля плённа выкарыстоўваў яе ў сваёй паэзіі.

Дзіцячыя гады Максіма Адамавіча прайшлі ў Гродна, куды пераехаў яго бацька ў 1892 годзе. Калі будучаму паэту споўнілася шэсць год, памерла яго маці. Бацька, у сувязі з новым назначэннем па службе, пераехаў з сям'ёй у Ніжні-Ноўгарад (цяпер Горкі).

У 1902 годзе М. Багдановіч паступіў у Ніжагародскую гімназію, дзе правучыўся да 1907 года. З пераходам Адама Юр'евіча на службу ў гор. Яраслаў (з прычыны нездароўя ён кінуў педагагічную работу ў 1892 годзе і стаў служыць у

сялянскім банку) яго сын Максім пераведзен быў у шосты клас Праслаўскай гімназіі. Гімназію М. Багдановіч скончыў у 1911 годзе.

Да 1911 года Максім Адамавіч ведаў аб Беларусі толькі з кніг, з расказаў свайго бацькі і яго сваякоў, якія ў той час жылі ў Ніжнім-Ноўгарадзе і Праслаўлі. Пасля сканчэння гімназіі Максім Адамавіч у час летніх вакацый паехаў у Беларусь. Паэт сваімі вачыма ўбачыў сваю радзіму, непасрэдна пазнаёміўся з жыццём беларускага народа і напісаў цэлы рад твораў аб жыцці беларускага сялянства.

Увосень 1911 года М. А. Багдановіч паступае ў Праслаўскі юрыдычны ліцэй. Вучэбная праграма ліцэя не задавальняе дапытлівага юнака, і М. Багдановіч вельмі многа працуе самастойна над павышэннем сваёй літаратурнай адукацыі.

Будучы гімназістам, М. А. Багдановіч вывучаў нямецкую, французскую, лацінскую і грэчаскую мовы і авалодаў імі настолькі, што мог перакладаць на беларускую мову Гарацыя, Овідзія, Гейне, Шылера, Верлена, Верхарна і інш. М. Багдановіч добра ведаў класікаў рускай і сусветнай літаратуры. Пісаў ён на беларускай, часткова на украінскай і таксама на рускай мовах.

Скончыўшы ў 1916 годзе юрыдычны ліцэй, М. Багдановіч прыязджае ў Беларусь, у гор. Мінск. У Мінску ён паступае на службу ў «Губернский продовольственный комитет», у якасці сакратара камітэта. М. Багдановіч быў членам Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны, арганізоўваў маладзёжныя гурткі грамадска-асветнага характару.

Але пражыў паэт у Мінску вельмі мала. Цяжка хварэючы на туберкулёз, Максім Адамавіч у лютым 1917 г. вымушан быў паехаць лячыцца ў Ялту. Не перамогшы цяжкай хваробы, 12 мая 1917 г. (ст. ст.) паэт памёр. Пахавалі яго на Ялцінскіх брацкіх могілках.

Максім Багдановіч памёр вельмі маладым, на 26 годзе свайго жыцця, але пакінуў досыць значную літаратурную спадчыну, якой ганарыцца наш народ.

Першы твор М. Багдановіча «Музыка» быў надрукаваны ў 1907 годзе ў газеце «Наша Ніва», на старонках якой ён галоўным чынам друкаваўся. У 1911 годзе, прыехаўшы ў Беларусь, паэт заязджаў у Вільню і пазнаёміўся там з прадстаўнікамі рэдакцыі газеты. Беларускія нацыянал-лібералы, якія кіравалі тады газетай «Наша Ніва», імкнуліся падпарадкаваць таленавітага паэта сваёй нацыяналістычнай ідэалогіі. Але нацыяналізм быў чуждым і варожым дэмакратычнаму светапогляду Багдановіча.

За час з 1907 па 1917 год М. Багдановічам напісана даволі значная колькасць лірычных вершаў, паэм, песень,

празаічных твораў, вялікая колькасць публіцыстычных артыкулаў і рэцэнзій па пытаннях літаратуры, мастацтва, музыкі, гісторыі і культуры. Пры жыцці паэта з друку выйшла толькі адна яго кніга вершаў «Вянок» (Вільна, 1913 г.). Пасля смерці паэта Акадэміяй навук БССР выдадзен поўны збор яго твораў у двух тамах.

## III

Максім Багдановіч быў буйнейшым, арыгінальнейшым мастаком слова. Будучы рэалістам, ён у сваёй творчасці праўдзіва адлюстроўваў некаторыя істотныя бакі рэчаіснасці, расшырыўшы тэматычнае і ідэйнае кола тагочаснай паэзіі. У яго творчасці гучаць матывы глыбокай чалавечнасці, гуманізма, жыццёрадаснасці, тонкіх інтымных перажыванняў чалавека, матывы паэтызацыі жанчыны-маці, міфалогіі, фальклорнай рамантыкі і інш.

Максім Багдановіч быў таленавітым наследнікам лепшых традыцый класічнай рускай і сусветнай літаратуры. Ён вучыўся паэтычнаму майстэрству ў Пушкіна і Лермантава, Шэўчэнкі і Горкага.

Але ў яго творчасці адчуваюцца ўплывы паэтыкі сімвалізма. Гэта відаць у вершах «Аб іконніку і залатару», «Калі ў ракавіну цёмную жамчужніцы», «Дзябольскаму», «Шмат у нашым жыцці ёсць дарог», «Хаўтуры», «Усё ў жыцці мне абрыдла» і інш., дзе матывы адзіноцтва, роспачы і тугі, адчаю і безвыходнасці знаходзяць пэўнае месца, а таксама выказваюцца погляды на мастацтва, як на форматворчасць. «Прызнаць мы мусім,—кажа Корж, герой, вуснамі якога аўтар выказвае свае погляды,—што каштоўнасць вырабаў прыгожых адно толькі красою форм, каштоўнасць тую мераць можна». Аднак у Багдановіча такія погляды і матывы песімізма былі эпізадычным момантам.

У сваіх поглядах на мастацтва і мастака М. Багдановіч прытрымліваўся пазіцый рэалістычнай школы. Ён марыў аб **народным мастацтве і народнай культуры.** Так, у артыкуле «Забыты шлях» Максім Багдановіч пісаў: «Каб улажыць што-небудзь сваё ў скарбніцу светавай культуры, каб уліць у нашую паэзію свежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народа, лепей паталіць яе духоўную смагу і сапраўды ўзяцца за вялікую працу: **развіццё беларускай народнай культуры»** [1]).

У артыкуле «Глыбы і слаі» Максім Багдановіч, гаворачы аб творчасці трагічна і заўчасна загінуўшага таленавітага беларускага пісьменніка Сергея Палуяна, даў вельмі

[1]) Творы М. Багдановіча, т. II, стар. 41.

высокую ацэнку тагочаснай беларускай дэмакратычнай літаратуры, да якой ён і сам належаў. Аўтар «Вянка» пісаў: «Моцна ціснула маладога пісьменніка сучаснае грамадзянскае жыццё, ды не пакарыўся ён яму, і за гэта заплаціў сваёй смерцю. Не забудзем-жа яго ў час барацьбы і абдалення, але няхай у нас прабуджаецца разам з тым і святая гордасць: наша пісьменнасць нярзвітая і каравая, але вялікім пачуццём напоўнена ўсё яе цела, не на грашовых справах трымаецца яна і ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу» [1]).

З гэтага, між іншым, яскрава відаць, што М. Багдановіч быў дэмакратам, глыбока прагрэсіўным пісьменнікам-патрыётам, які верыў у сілы народа і яго літаратуры.

У першым сваім творы «Музыка» (1907 г.) М. Багдановіч гаварыў аб народным мастаку-музыку, аб сіле народнага мастацтва. Ён падкрэсліваў шчыльную сувязь паэта з жыццём народа, дзейснае значэнне паэзіі, яе актыўнае ўздзеянне на рэчаіснасць. «А бывала яшчэ і так, што музыка быццам вырастаў у вачах людзей, і тады іграў моцна, гучна: гудзяць струны, звоніць рымка, бас, як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і завець ён народ. І людзі падымалі апушчаныя галавы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы.

Тады бляднелі і трасліся, як у ліхаманцы, і хаваліся ад страху, як тыя гадзюкі, усе крыўдзіцелі народа. Многа іх хацела купіць у музыкі скрыпку яго, але ён не прадаў яе нікому. І хадзіў ён далей між бедным людам і граннем сваім будзіў ад цяжкага сну».

І калі музыку, прадстаўніка рэвалюцыйнага народнага мастацтва, «злыя і сільныя людзі» кінулі ў турму, «і там скончылася яго жыццё», а на яго скрыпцы пачалі іграць самі «злыя і сільныя людзі», то ў іх нічога не магло атрымацца, «іхняе гранне нічога людзям не сказала». «Ніхто не мог растлумачыць, чаму ад грання музыкі так моцна білася сэрца бедакоў. Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён на людзях; гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора».

Тут вельмі яскрава выказана М. Багдановічам думка аб тым, што мастацтва толькі тады становіцца сапраўдным мастацтвам, калі яно служыць народу, непасрэдна звязана з яго жыццём, думамі і пачуццямі, што паэт толькі тады дасягае ўздзеяння на сэрцы людзей, калі ён у сваёй творчасці выказвае тое, чым жыве народ, тое, што патрэбна народу.

---

[1]) Творы М. Багдановіча, т. II, стар. 12,

Ідэя самаахвярнага служэння мастака народу, ідэя бяссмерця народнага мастацтва выказваецца М. Багдановічам у заключных радках апавядання «Музыка».

«Прайшло шмат гадоў з таго часу. Скрыпка разбілася. Але памяць аб музыку не загінула з ім разам. І з таго народа, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе...» [1]).

Гэтыя словы М. Багдановіча па свайму гуманістычнаму пафасу, па сваёй рамантычнай імклівасці і мастацкай таленавітасці нагадваюць словы Максіма Горкага з твора «Песня о Соколе»: «О смелый сокол! В бою с врагами истек ты кровью... Но будет время — и капли крови твоей горячей, как искры, вспыхнут во мраке жизни, и много смелых сердец зажгут безумной жаждой свободы, света. Пускай ты умер!.. Но в песне смелых и сильных духом всегда ты будешь живым примером, призывом гордым к свободе, к свету!».

Гэтая пераклічка беларускага паэта з вялікім Горкім невыпадкова. Як і ўся беларуская дэмакратычная літаратура, творчасць М. Багдановіча развівалася пад ідэйным уплывам А. М. Горкага.

## IV

Сіла паэзіі М. Багдановіча заключаецца перш за ўсё ў тым, што паэт, як вялікі мастак, адлюстраваў рэальныя бакі тагочаснай рэчаіснасці, паказаў гаротнае і бяспраўнае жыццё працоўных мас беларускага народа ва ўмовах капіталістычнага ладу.

Як у філасофскай лірыцы Багдановіча, так і ў лірыцы кахання, прыроды, лірыцы грамадзянскага характару разам з тужлівымі і журботнымі матывамі даволі моцна гучаць аптымістычныя матывы жыццёрадаснасці і жыццёсцвярджэння. Багдановіч і ў сваёй філасофскай лірыцы апяваў радасць жыцця. Жыццё чалавека павінна быць хвалюючым, шырокім, паўнацэнным:

Каб хвалявалася жыццё,
Каб больш разгону ў ім было,
Каб цераз край душы чуццё,
Не раз, не два пайшло.
Жыві і цэльнасці шукай,
Аб шырацe духоўнай дбай.

Матывы філасофскага аптымізма, бадзёрых поглядаў на жыццё чалавека, настроі барацьбы і ўпэўненасці ў перамозе жыцця над смерцю, у перамозе ўсяго жывога, растучага

[1]) Творы, М. Багдановіча, т. І, стар. 186.

над аджыўшым, загніваючым, усім тым, што «скончыла жыць», выказваецца М. Багдановічам у многіх вершах. Так, напрыклад, у вершы «Рушымся, брацця, хутчэй» паэт гаворыць:

Рушымся, брацця, хутчэй
У бой з жыццём, пакідаючы жах;
Крыкі пужлівых людзей
Не стрымаюць хай бітвы размах...
Проці цячэння вады
Зможа толькі жывое паплыць,
Хвалі-ж ракі заўсягды
Тое цягнуць, што скончыла жыць.

У асобных сваіх вершах М. Багдановіч падымаецца да рэволюцыйнага пафасу. У вершы «Нашых дзедаў душылі абшары лясоў» ён заклікае «не хіліцца з бяды, не пужацца агня, бо мы толькі тады дачакаемся дня, калі нас не здоле змагання злякаць».

Ідэя аб тым, што толькі рэволюцыя абнаўляе жыццё, толькі рэволюцыя адкрывае яго сапраўдныя каштоўнасці, выказана М. Багдановічам у наступным алегарычным вершы:

Устань, навальніца, мкні нанова,
Узвый, вецер, з ёю за адно!
У віхры уляціць палова,
Пакіне чыстае зярно.
Удар, цыклон, удар па мора,
Цалуй яго ў глухое дно,
Усплясні ваду—і перлаў горы
На бераг выкіне яно.

Своеасаблівасць Багдановіча ў раскрыцці інтымных перажыванняў або пачуццяў кахання заключаецца ў тым, што ён надзвычай тонка ў рэалістычным плане паэтызуе каханне як красу і шчасце маладосці:

Маладыя гады,
Маладыя жаданні!
Ні жуды, ні нуды,
Толькі шчасце кахання,
Помніш толькі красу,
Мілы тварык дзявочы,
Залатую касу,
Сіняватыя вочы.
... Будзе-жа, век малады,
Поўны светлымі днямі!
Пралятайце, гады,
Залатымі агнямі.

Каханне — вельмі моцнае пачуццё; яно мацней смерці, яно перамагае смерць.

Матыў—каханне перамагае смерць, пераклікаецца з ідэяй паэмы А. М. Горкага «Девушка и смерть», аб якой таварыш І. В. Сталін сказаў, што «гэта рэч мацней, чым «Фауст» Гётэ. Каханне перамагае смерць».

Гэты горкаўскі матыў у своеадменнай і арыгінальнай форме беларускі паэт распрацоўвае ў вершы «На могілках» (1913 г.). Тут даецца міфалагічны вобраз Амура, увасабляючага сабой бескарыслівае каханне, якое перамагло «смерці жах»:

Паўсюль крыжы, вянкі... Чаго-жа?
Тут, дзе магілы, сцёнь і прах,
Амур і сумны і прыгожы
Стаіць з павязкай на вачах.
І ціха думаў я: быць можа,
Любоў, палегшы у трунах,
Перамагла і смерці жах.
Спачнеце-ж! Вечна на старожы
Амур і сумны і прыгожы.

А колькі прыгожых і ўзвышаных пачуццяў бескарыслівага кахання і дружбы выказана паэтам у высокамастацкіх творах «Вераніка» і «Зорка Венера ўзышла над зямлёю»!

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла..
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца,
У неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але растацца нам час наступае;
Пэўна, ужо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але растацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
У сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.
Глянь іншы раз на яе—у растанні:
Там з ёй злiём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе.

Чалавечнасць і шчырасць выражаных пачуццяў, дум і настрояў, прастата мастацкай формы, яснасць паэтычнай мовы зближае лірыку інтымных перажыванняў Багдановіча

з раннімі вершамі любоўнай лірыкі вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна.

У лірыцы інтымных перажыванняў Багдановіча на першым плане—рэалістычныя моманты. Рэалістычнасць вобразаў, праўдзівасць перажыванняў, сапраўдная чалавечнасць заложаных у ёй пачуццяў робіць яе ў вялікай меры блізкай нашай соцыялістычнай эпосе.

## V

У сваёй пейзажнай лірыцы М. Багдановіч паказвае хараство прыроды, яе разнастайныя праявы. Паэт любіў прыроду. Яму ўласціва тонкае адчуванне і разуменне прыроды. Прырода ў творах Багдановіча разнастайна і багата, поўна жыцця і чароўнай красы. Пейзаж Багдановіча раскрываецца ў цеснай сувязі з настроямі, думамі і душэўнымі перажываннямі паэта. Гэта асабліва ярка праяўляецца ў такіх вершах паэта, як «Прывет табе, жыццё на волі», «Блішчыць у небе зор пасеў», «Цёплы вечар, ціхі вецер», «Добрай ночы, зара-зараніца», «Зімовая дарога», «Зіма», «Перад паводкай» і інш.

З вялікім паэтычным майстэрствам Багдановіч перадае лірычныя ўспрыяцці зімовай прыроды:

Уюцца змейкай срабрыстай дарожкі,
Брызгі золата ў небе блішчаць,
І маркотныя месяца рожкі
Праз марозную мглу зіхацяць.
Поле нікне у срэбным тумане,
Снег блішчыць, як халодная сталь,
І лятуць мае лёгкія сані,
Уношуся я ў сінюю даль.

У вершы «Зімовы вечар» лірычны малюнак зімы напісан з крыштальнай яснасцю і паэтычнай чоткасцю:

Здароў, марозны, звонкі вечар,
Здароў, скрыпучы, мяккі снег.
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.
Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

У лірычным вершы «Перад паводкай» паэт зарысаваў яркую карціну веснавой паводкі:

Праясняецца пагода,
Бо вярнулася вясна.
Усе чакаем, што прырода

Устрапянецца ада сна.
І пад птушы крык і гоман,
Даўшы хвалям вольны ход,
Прыпадніме бацька Нёман
На хрыбце магутны лёд.

Гэты верш сваёй мастацкай канкрэтнасцю вобразаў, прастатой і выразнасцю мовы і рытма нагадвае лепшыя вершы пейзажнай лірыкі Якуба Коласа.

Тонкае і глыбока лірычнае адчуванне прыроды, прастата і рэалістычная канкрэтнасць у яе адлюстраванні праяўляецца і ў вершы ў прозе «Над морам». Гэты твор Багдановіча напісан не без уплыву рамантычных апавяданняў Горкага. У ім дадзена зарысоўка марскога пейзажа. Велічны вобраз марской буры падымае ў душы паэта пачуцці гордасці, сілы, магутнасці і напаўняе паэта радасцю, аптымістычнымі настроямі. «Учора йшчэ буры раскаты грымелі, выў вецер шалёны, насіліся чайкі над морам, як белыя снежныя ком'і, і цёмназялёныя хвалі ў вышу ўзмывалі сцяною, рассыпаўшы белыя кудры; узмывалі, каціліся ў моры, адна за адной набягалі на дзікі абрывісты бераг,—і бурыя скалы трасліся пад вагай іх цяжкіх удараў, сваімі грудзямі на брызгі вады разбіваючы глыбы. Паветра стагнала, і хвалі пад грохат і гул пагібалі так горда, весела і вольна, пакінуўшы думкі аб смерці!

І я быў вясёлы і горды. І мне пачуцце волі хваля, налінуўшы, упалыя грудзі высока ўгару падымала, змываючы з сэрца ўсю ціну. І ўсё, што ў ім спала глыбока, тады прабудзілася разам, зрабілася цэльным, магутным. І чуў я, свабодны і моцны, так, чуў, што і я чалавек!»

У пейзажнай лірыцы Багдановіча рэалістычныя карціны прыроды займаюць галоўнае месца; у іх праяўляецца высокі эстэтычны густ паэта, яго любоў да прыроды, яго тонкае паэтычнае майстэрства мастака слова.

## VI

Максім Багдановіч быў патрыётам-дэмакратам. Ён сваімі вачыма бачыў той жахлівы соцыяльна-нацыянальны прыгнёт, пад якім ва ўмовах царызма знаходзіліся працоўныя масы беларускага народа. І ў асобных сваіх вершах («У вёсцы», «Доля мужыка», «Краю мой родны» і інш.) паэт праўдзіва зарысоўвае бязрадасны малюнак беларускай вёскі, у якой «панураю чаргой з абодвух бакоў крывой і вузкай вуліцы хаты стаялі—шэрыя, струхлеўшыя як латы віднеліся ў сценах сляпыя вокны іх, і аж чарнелася салома стрэх гнілых». Верш «У вёсцы» па сваёй рэалістычнай манеры пісьма, яснасці і чоткасці вобразаў нагадвае вядомы верш А. С. Пушкіна «Румяный критик мой».

М. Багдановіч з гораччу гаворыць аб цяжкай долі працоўнага селяніна. У вершы «Мае песні» (1908 г.) паэт сам гаворыць аб своеадменнасці суму і тугі сваіх песень:

А як родную згадаю старану,
Як згадаю яе беднасць і нуду,—
Сэрца сціснецца, і я пяяць пачну,—
Мо' душу хоць трохі гэтым адвяду.
Грозна песня разліваецца, грыміць,
Долю горкую мужыцкую кляне,
Бо нявідзімы ланцуг на іх вісіць,
Бо ім цяжка жыць у роднай старане.

У вершы «Краю мой родны» (1909 г.) паэт дае глыбока праўдзівы малюнак жыцця беларускага народа ва ўмовах царызма:

Поруч раскідаліся родныя вёскі,
Жалем сціскаюцца грудзі.—
Бедныя хаткі, таполі, бярозкі,
Усюды панурыя людзі...
Шмат што зрабілі іх чорныя рукі,
Вынеслі моцныя спіны;
Шмат іх прымусілі выцерпець мукі
Пушчы, разлогі, нізіны.
Кінь толькі вокам да гэтага люду—
Сціснецца сэрца ад болю:
Столькі пабачыш ты гора усюды,
Столькі нуды без патолі.

Праўдзівы, выключны па сваёй мастацкай сіле малюнак паднявольнай працы і жабрацтва працоўных мас Беларусі паэт стварае ў вершы «Мяжы» (1914 г.). Рукамі працоўнага чалавека,—піша паэт,—створаны «ўсе багацтвы на зямлі», а сам ён мусіць «нішчацца ў голадзе, у зморы ад беднаты, ад цемнаты». І ўсё гэта ад таго, што «вакол яго—платы, мяжы», г. зн. пануе соцыяльны і нацыянальны ўціск:

Пабач, што робіцца за гэтымі платамі!
У надмернай працы гіне тут
Галодны і абдзёрты люд,
Каторы моцнымі рукамі
Стварыў усе багацтвы на зямлі:
Правёў ён скібы на раллі,
Ён рэйкі пралажыў чугунак,
Заводаў коміны падняў у выш нябёс,
А сам даўно сляпы ад слёз
І ўжо забыўся аб ратунак.
Глядзі; па ўсёй зямлі святой

Шырокай хваляй залатой
Бяскраю блішча збожжа мора,
Цвітуць лагі, шумяць лясы...
Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы,
А людзі нішчацца у голадзе, у зморы
Ад беднаты, ад цемнаты,
Бо скрозь—мяжы, бо скрозь—платы.

Гэтыя радкі па свайму ідэйнаму пафасу, па сваёй сіле мастацкага абагульнення з'яўляюцца прысудам гуманіста-дэмакрата капіталістычнаму грамадству, дзе «у надмернай працы» «людзі нішчацца ў голадзе, у зморы».

Есць у Багдановіча некалькі вершаў («Я хлеба ў багатых прасіў і маліў», «Вы, панове, пазіраеце далёка», «Пан і мужык», «Слуцкія ткачыхі» і інш.), у якіх паэт прабуе паказаць социяльна-класавыя супярэчнасці паміж багатымі і беднымі. У вершы «Пан і мужык», селянін, усвядоміўшы сваю сілу, іранічна заяўляе па адрасу паноў:

Дзякуй, пане, бо пазнаў ад вас і я,—
Не на трох кітах трымаецца зямля.
Згода, згода, бо здаецца неяк мне,
Што стаіць яна на нашай-жа спіне.

У вершы «Я хлеба ў багатых прасіў і маліў» паэт гаворыць, што паміж багатымі і беднымі вырасла вялізная сцяна з каменняў, якая падзяляе людзей на два процілеглыя варожыя лагеры. Багдановіч прадчувае, што гэтая сцяна павінна рухнуць і пад сабой пахаваць прыгняталь-нікаў:

Я хлеба ў багатых прасіў і маліў,—
Яны-ж мне камені давалі;
І тыя камені між імі і мной
Сцяною вялізнаю сталі.
Яна ўсё вышай і вышай расце,
І шмат каго дужа лякае.
Што-ж будзе, як дрогне, як рухне яна?
Каго пад сабой пахавае?

Тут паэт падымаецца да ўсведамлення таго, што класавыя супярэчнасці паміж багатымі і беднымі могуць прывесці да социяльнай рэволюцыі.

З вялікім паэтычным майстэрствам пададзены ў вершы «Слуцкія ткачыхі» яркія малюнкі бесчалавечнай эксплаатацыі беларускіх сялян на прыгонніцкіх фабрыках.

Адарваныя ад блізкіх і родных, ад сваёй хаты, сваіх дзяцей, прыгонныя жанчыны ўзяты «ў панскі двор» «ткаць залатыя паясы»:

Ім не пабачыць роднай хаты,
Не ўчуць ім дзетак галасы
Яны ў панскі двор узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Аб шчасці ўжо забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.

Цяжкае становішча прыгнечанага народа нашай радзімы ў часы царскага самаўладства ярка нарысавана М. Багдановічам у творы «Народ, Беларускі народ».

Багдановіч любіў свой народ, любіў сваю краіну. Ён у многіх сваіх вершах выказваў сваю бязмежную любоў да народа і веру ў яго сілы, у прыход лепшай будучыні. У вершы «Не блішчыць у час змяркання» беларускі народ, які знаходзіўся пад прыгнётам царызма, паказваецца ў вобразе каштоўнага дыямента. Таксама як і «дыямент каштоўны» «не блішчыць у час змяркання і ў глыбокай цемені начы», «але белым днём... калі на гэты камень упадзе праменне сонца ўраз, ён блісне дзіўна і вясёлкавыя іскры рассыпаць пачне без конца»,—так і беларускі народ,—гаворыць паэт,—падобна каштоўнаму дыяменту, «здаецца ў змроку ночы цёмным і народ мой родны, бедны і няшчасны; але як устане сонца, ўраз прачнецца дух народны і засвеціць ясна».

У плане рэвалюцыйна-патрыятычнай сімволікі напісан цудоўны санет Багдановіча, прысвечаны А. Пагодзіну. Першая частка гэтага санета змяшчае сімвалічны вобраз засохшага насення, якое захоўвалася ў гаршку і знаходзілася ў магіле «паміж пяскоў Егіпецкай зямлі, над хвалямі сінеючага Ніла». Але калі яны былі «парой вясенняй» кінуты «на раллі», то «жыццёвая іх сіла збудзілася і буйна ўскаласіла». У другой частцы гэтага твора паэт растлумачвае сутнасць сімвала-вобраза і выказвае веру ў светлае будучае сваёй краіны:

Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў, крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

Верш «Дождж у полі і холад» прасякнуты рашучым пратэстам супраць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску; у ім Багдановіч заклікае на барацьбу з сацыяльнай няпраўдай:

Цісне сэрца мне песня начная.—
Хай-жа голасна вецер спявае,
Хай пяе ён у роднай зямлі,
Каб у сэрцах нам сорам збудзіць,
Каб змагацца з няпраўдай ішлі,
У чыім сэрцы сумленне не спіць.

Паэт упэўнен, што беларускі народ дачакаецца свайго вызвалення з-пад гнёту царызма:

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
Паглядзі, як усход разгараецца,
Сколькі ў хмарах залётных агня...

Натхнёна заклікаў Багдановіч сваю краіну шукаць сабе свабоднага шляху:

Ты не згаснеш, ясная заранічка,
Ты яшчэ асвеціш родны край.
Беларусь мая! Краіна-браначка!
Устань, свабодны шлях сабе шукай!

Апяванне свабоды, вера ў невычарпальныя сілы і здольнасці народа, вера ў яго светлую будучыню і гарачае жаданне бачыць свой край і народ вольным і шчаслівым— асноўныя матывы грамадзянскай лірыкі Багдановіча.

Матыў самаахвяравання чалавека для шчасця радзімы і народа гучыць прыгожым акордам у патрыятычнай лірыцы Багдановіча. Сапраўдны чалавек павінен быць гатовым ахвяраваць сваё жыццё за радзіму, ён не павінен палохацца смерці:

Таварышы-брацця! Калі наша родзіна-маць
У змаганні з нядоляй патраціць апошнія сілы,
Ці хваціць нам духу ў час гэты жыццё ёй аддаць,
Без скаргі лягчы ў магілы?

## VII

Багдановіч любіў вусную народную творчасць і як паэт выкарыстоўваў яе невычарпальныя багацці ў сваёй паэзіі. Беларуская народная песня і казка былі першакрыніцай, адкуль Багдановіч чэрпаў паэтычныя сродкі і маляўнічыя фарбы для сваёй творчасці.

М. Багдановіч творча выкарыстоўваў фальклор. Ён не намагаўся падрабляцца пад народную песню, а пісаў у народным духу, ствараючы паэзію цудоўнай якасці.

Шырока выкарыстоўваючы беларускі фальклор і фальклор брацкіх народаў (рускі і ўкраінскі), паэт узбагачаў

паэтычныя формы сваёй паэзіі мастацкай свежасцю, народнай прастатой, маляўнічасцю мовы, каларытнасцю вобразаў, рытмаў.

У такіх вершах М. Багдановіча, як «Ой лясы-бары ды лугі-разлогі», «Сярод вуліцы ў нас карагод», «У мястэчку Берасцечку не званы гудуць», «Цёмнай ноччу лучына дагарала», «Лявоніха», «Вершы беларускага складу», «Не кувай ты, шэрая зязюля», «Эміграпская песня» і інш., вельмі мастацка выкарыстана паэтам народна-песенная рытміка і музычнасць фальклорнай лірыкі.

Творы «Максім і Магдалена», «Страцім-лебедзь» напісаны ў плане народна-гераічнага быліннага эпасу. Для іх характэрна глыбокая народнасць мовы і фальклорная прастата слоўна-маляўнічых сродкаў і рытмікі.

«Максім і Магдалена»—твор аб глыбока чалавечным каханні прыгоннага селяніна і трагічнасці гэтага кахання ва ўмовах прыгонніцкага ладу. За тое, што Максім пакахаў Магдалену, яго смерцю пакаралі, «рукі белыя да брамы прыбівалі, рукі белыя да брамы маставой, галаву да вежы вартавой, каб дажджы яму кудры мачылі, а вятры-бы сушылі, каб крукі пралятали—вочы дзюбалі, усе-бы людзі пазіралі—ды не забывалі».

Вобраз пратэстанта і бунтара супраць прыгонніцкага ладу зарысаван Багдановічам вельмі каларытна ў форме быліннага эпасу, фальклорнай рамантыкі. Ён смелы, рашучы, непакорлівы. Цымбаліста Максіма ў ланцугі закавалі, «павялі на пляц кірмашовы, на памост высокі сасновы», павялі караць смерцю. «Людзі добрыя навакол стаяць», «ды не жаліцца да людзей Максім, толькі кажа ён аб цымбалы ім, хоча зноў пачуць, тое граніцца, у астатні раз, у смяротны час, на апошняе са светам развітанніца:

Вокам кінуць—цымбалы дасталі,
На памост на высокі паклалі.
Устрахнуў Максім кудрамі—годзе плакаць, годзе.
Цяжка-важка, сумнесенька ён заводзе:
«Не вятрыска са поўначы павявае—
Ціхі сон у камору ўступае,
Вочы мне стуляе, а цьмянжае.
То не птушка ў гняздзечку ўстрапянулася—
Маё сэрца ўлякнулася.
... Праз цябе, дзявоцкая краса,
Слёзы коцяцца, як буйная раса».
...Устрахнуў Максім кудрамі—годзе плакаць, годзе.

У духу народна-гераічнага эпасу Багдановіч рысуе алегарычны вобраз Страцім-лебедзя, як сімвал дужасці, смеласці, адвагі і самаахвярнасці:

Страцім-лебедзь—горды, моцны птах,
Яго ўцехі—сакаліныя;
Пер'і—пер'ечкі бялеюцца
Ды на золку агнявеюцца.
У яго крыле—трыста тры пяры;
Узмахне крылом—быццам бор шуміць,
Узмахне другім—што мяцель гудзіць.

## VIII

М. Багдановіч—вялікі майстра дасканаласці вершаванай тэхнікі. У вершы «Песняру» ён патрабаваў ад паэта «з сталі каваць, гартаваць гібкі верш», апрацоўваць яго з цярпеннем, умела, каб ён быў моцным, звінеў, як звон, і будзіў у сэрцах людзей святое сумленне. Сам Багдановіч быў майстрам-віртуозам кароткага лірычнага верша. Ён сапраўды, як з сталі, каваў і гартаваў свае вершы, рабіў іх моцнымі, дасканалымі, паэтычна-прыгожымі, гучнымі, музыкальнымі, строгімі, арыгінальнымі.

Наследуючы лепшыя традыцыі рускай класічнай літаратуры, М. Багдановіч шырока выкарыстоўваў разнастайныя формы лірычнага верша, а таксама кананічныя формы, як трыалет, санет, рондо, тэрцыны, актава, і паспяхова пісаў у гэтых формах.

Асабліва шырока М. Багдановіч практыкаваў трыалеты і санеты. Яны стаяць на высокай ступені паэтычнага майстэрства. Вось трыалет Багдановіча, які пачынаецца радком «Мне доўгае растанне з вамі». Ён складаецца з васьмі радкоў, прычым першы радок паўтарае чацверты, а затым першы і другі паўтарае сабой сёмы і восьмы.

Мне доўгае растанне з Вамі
Чарней ад вашых чорных кос.
Чаму-ж не добры час прынёс
Мне доўгае растанне з Вамі?
Я паблядней ад горкіх слёз
І трыалет пачаў славамі:
Мне доўгае растанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.

Санет, які пачынаецца славамі «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі», адпавядае ўсім правілам класічнага санета: складаецца з чатырнаццаці радкоў пяцістопнага ямба і падзяляецца на дзве часткі. У першай частцы—двух чатырохрадковых строфах—выказваецца ў вобразе-сімвале філасофская думка аб няспыннасці жыццёвай сілы, якая заключаецца ў засохшым зерні, знойдзеным у гаршчочку «сярод пяскоў Егіпецкай зямлі». У другой частцы—двух трохрадковых строфах,—растлумачваецца гэты вобраз-сімвал і па-

раўноўваецца з родным краем—Беларуссю, якая шляхам рэвалюцыйнай барацьбы стане вольнай, як «крыніца, каторая магутна, гучна мкне, здалеўшы з глебы на прастор прабіцца».

М. Багдановіч у цэнтры сваёй паэтычнай увагі ставіў музыкальную вобразнасць мовы і іншых мастацкіх сродкаў. Ён быў майстрам у галіне гукавой апрацоўкі вершаў.

## IX

Значэнне Максіма Багдановіча як дэмакрата-гуманіста ў гісторыі беларускай літаратуры заключаецца перш за ўсё ў тым, што ён як таленавіты паэт узнімаў культуру беларускай паэзіі таго часу на вышэйшую ступень, узнімаў беларускую паэзію да ўзроўню сусветнай класічнай літаратуры.

Вершы інтымнай лірыкі, лірыкі прыроды, грамадзянскай лірыкі, дзе высокамастацка выражаны глыбокія пачуцці чалавечнасці, мудрыя філасофскія думкі аб жыцці, благародная любоў паэта да працоўнага народа і радзімы, палымяная вера ў светлае будучае, з'яўляюцца залатым фондам літаратурнай спадчыны Максіма Багдановіча.

Для нас дораг Максім Багдановіч сваім палымяным дэмакратычным патрыятызмам, сваёй цвёрдай упэўненасцю ў тое, што беларускі народ дачакаецца свайго вызвалення з-пад уціску царызма і што яго перадавая літаратура «ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу», а стане на шлях развіцця «беларускай народнай культуры».

Аптымістычныя думкі Максіма Багдановіча збыліся. У выніку Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі беларускі народ з рук партыі Леніна—Сталіна атрымаў сваю дзяржаўнасць, стаў свабодным і шчаслівым і ва ўмовах савецкай улады стварае сваю глыбока народную, нацыянальную па форме і соцыялістычную па зместу культуру і літаратуру.

---

Тэхрэдактар *Х. Александровіч*
Карэктар *Е. Брэгман*

АТ 02581. Падпісана да друку 26/XI-1949 г. Тыраж .10.000 экз.
Папера 60×92 1/16 Вуч. аўт. арк. 0,8. Друк. арк. 1 1/4 Заказ 593.

Друкарня Акадэміі навук БССР, Мінск, Пушкіна, 56.

Цана 1 руб.

Бел. аддзел
Літаратур.

Бел. аддз
1994 г.

B00000003073268

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ
М. Г. Ларченко
ТВОРЧЕСТВО МАКСИМА БОГДАНОВИЧА
Издательство Академии наук БССР
Минск 1949